# ГЕАГРАФІЯ

УДК 991(476)

*Н. Г. Бялкоўская*

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ПРАБЛЕМЫ НЕЛЕГАЛЬНАЙ МІГРАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Міграцыйныя працэсы ў Рэспубліцы Беларусі ў апошнія гады перараслі ў адну з дзяржаўных праблем. Сёння яны адлюстроўваюць сацыяльныя, эканамічныя і палітычныя супярэчнасці не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі. Характар міграцыі ў Беларусі, як і ў іншых постсавецкіх рэспубліках, вызначаецца ўплывам дзвюх груп фактараў: дэструктыўных і канструктыўных.

Да дэструктыўных неабходна аднесці негатыўныя наступствы распаду СССР: палітычную нестабільнасць, сацыяльна-эканамічны крызіс, рост нацыяналізму, узброеныя канфлікты ў некаторых постсавецкіх краінах. У недалёкім мінулым не ўсе нядаўна ўтвораныя дзяржавы прызнавалі пераемнасць правоў асобы (права на грамадзянства, атрыманне ў спадчыну маёмасці, пенсіі, захаванне працоўнага стажу, навучанне на роднай мове і інш.) для тых, хто апынуўся не ў сваёй краіне. Гэта выклікала паніку сярод мігрантаў мінулых гадоў і да гэтага часу правакуе адваротныя міграцыйныя патокі. Разам з тым пры гэтым рэзка знізілася міграцыйная мабільнасць насельніцтва. Стрымліваючымі фактарамі міграцыі з'яўляюцца адрозненні паміж новымі дзяржаўнымі і палітычнымі сістэмамі, у характары рэфармавання эканомікі, ва ўзроўні і якасці жыцця насельніцтва, у адсутнасці працы і жылля, сацыяльнай стабільнасці, этнічнай цярпімасці.

Паралельна дзейнічалі і дзейнічаюць новыя стымулюючыя канструктыўныя фактары, такія, як пераход да палітыкі адкрытых дзвярэй, уключэнне постсавецкіх краін у сістэму міжнародных міграцый, дэмакратызацыя жыцця, пашырэнне правоў і свабод асобы, у тым ліку свабоды перамяшчэння.

Уведзенне ў дзеянне закона, які забяспечвае свабоду ўезду і выезду з краіны ўсіх грамадзян, [illegible]ае дэкларaванне правоў на свабоду перамяшчэння, выбар месца жыхарства ў тэрыторыі РБ стваралі ўмовы для змянення міграцыйных працэсаў у Беларусі.

У выніку геаграфічнага і геапалітычнага месцазнаходжання, а таксама адкрытасці граніцы на ўсходнім напрамку,працэсы, якія адбываюцца ў галіне міжнароднай міграцыі, істотна закранулі Рэспубліку Беларусь. Па шэрагу прычын на працягу апошніх пяці гадоў для Беларусі сур'ёзнай праблемай стаў рост нелегальнай і эканамічнай міграцыі замежных грамадзян.

Аналіз прычын прыбыцця незаконных мігрантаў на тэрыторыю Беларусі дазваляе зрабіць вывад, што асноўны паток мігрантаў накіроўваецца ў рэспубліку з мэтай далейшага следавання ў развітыя дзяржавы Скандынавіі і Заходняй Еўропы. Пры гэтым звяртае на сябе ўвагу той факт, што прыбываюць указаныя асобы пераважна з краін, дзе сёння актыўна дзейнічаюць міжнародная наркамафія і тэрарыстычныя арганізацыі, ідуць ваенныя дзеянні, нярэдкія выпадкі захворваннямі ВІЧ і іншымі інфекцыйнымі хваробамі.

Не можа не выклікаць заклапочанасці той факт, што візавая палітыка дзяржаў СНД не адрозніваецца абмежаванасцю ў выдачы віз патэнцыяльным нелегальным мігрантам, якія, як правіла, прыбываюць з краін Паўднёва-Усходняй Азіі і Афрыканскага рэгіёну. Адсутнасць ахоўваемай дзяржаўнай граніцы ў Расіі на паўднёвых рубяжах дазваляе такім асобам з тэрыторыі Таджыкістана, Узбекістана, Казахстана, Азербайджана і некаторых іншых краін бесперашкодна прыбываць на яе тэрыторыю і затым уязджаць у Рэспубліку Беларусь.

Асаблівасцю міграцыйнай сітуацыі на дзяржаўнай граніцы ў 2003 г. стала павелічэнне колькасці затрымліваемых незаконных мігрантаў з ліку: грамадзян Ірака (у сувязі з чакаемым пачаткам баявых дзеянняў быў адзначаны рэзкі ўсплёск колькасці незаконных мігрантаў, у гэтым годзе было затрымана 25 іракцаў, 4 з якіх папрасілі палітычнага прыстанішча ў Рэспубліцы Беларусь); грамадзян КНР, у сувязі з узмацненнем жорсткасці міграцыйнай палітыкі Расійскай Федэрацыі і неспрыяльнымі санітарна-эпідэміялагічнымі абставінамі ў КНР (за 9 месяцаў 2003 г. затрымана больш за 200 мігран-

таў — грамадзян КНР, у той час як за ўвесь 2002 г. — 50); грамадзян дзяржаў СНД, перш за ўсё Малдовы і Расіі (у асноўным выхадцаў з Чачні), якія імкнуцца да незаконнага выезду ў краіны Заходняй Еўропы (адзначаныя грамадзяне, у адпаведнасці з Пагадненнем аб супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў у барацьбе з незаконнай міграцыяй ад 6 сакавіка 1998 г., як незаконныя мігранты, Рэспублікай Беларусь не ўлічваюцца). Да лістапада 2004 г. у РБ было затрымана 92 чалавекі (6 груп), якія спрабавалі нелегальна перайсці граніцу нашай рэспублікі.

Аналіз абставін сведчыць, што значная частка незаконных мігрантаў па-ранейшаму ўязджае ў СНД і далей у Рэспубліку Беларусь на законных падставах — па прыватных запрашэннях, па турыстычнай, вучэбнай, працоўнай візе з далейшым намерам выезду ў краіны Заходняй Еўропы і Скандынавіі. Нараўне з традыцыйнымі спосабамі пранікнення патэнцыяльных нелегальных мігрантаў у Рэспубліку Беларусь дастаткова часта выкарыстоўваюцца вытанчаныя шляхі, у тым ліку Інтэрнет для рэкламы процiпраўнай дзейнасці арганізатараў незаконнай транзітнай міграцыі, якія выступаюць пад прыкрыццём фіктыўных турыстычных фірм. У якасці сродку сваёй легалізацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь арганізатары выкарыстоўваюць фіктыўныя шлюбы, запрашэнні вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі і прыватных асоб. Аднак у апошні час павялічваецца колькасць замежных грамадзян, якія выкарыстоўваюць неафіцыйныя каналы перасячэння граніц без дакументаў або з дапамогай фальшывых дакументаў, атрымаць якія ім дапамагаюць арганізацыі, што спецыялізуюцца на такіх паслугах. Так, асноўная маса затрыманых грамадзян КНР, якія спрабавалі незаконна перайсці дзяржаўную граніцу Рэспублікі Беларусь праз пункты пропуску, мела грамадзянскія пашпарты Японіі. Плата за паслугі па пераправе аднаго мігранта вагалася ад 1000 да 10000 долараў ЗША (у залежнасці ад спосабаў перамяшчэння і ступені надзейнасці канала).

Неабходна ўпамянуць аб сацыяльна-эканамічных аспектах незаконнай транзітнай міграцыі для Рэспублікі Беларусь. Незаконныя мігранты, што знаходзяцца на тэрыторыі рэспублікі ў чаканні выезду на Захад, ператвараюць краіну ў так званы «адстойнік» і, не маючы стабільнага занятку і дастатковых сродкаў для існавання, папаўняюць маргінальныя групы «ізгояў грамадства», якія становяцца крыніцай злачыннасці, пагрозы праяўлення тэрарызму і экстрэмізму. Акрамя таго, у цяперашні час асаблівую пагрозу незаконная транзітная міграцыя ўяўляе з пункту гледжання санітарна-эпідэміялагічнага становішча ў краіне.

Інфармацыя, якая маецца ў органах унутраных спраў Беларусі, а таксама назапашаны вопыт работы сведчаць, што ў цяперашні час транзіт нелегальных мігрантаў праз тэрыторыю рэспублікі ажыццяўляюць добра арганізаваныя міжнародныя злачынныя групоўкі, якія валодаюць сучаснымі сродкамі сувязі, запланаванымі маршрутамі руху, павышанай канспірацыяй. Яны імкнуцца стварыць супольную базу сярод праваахоўных органаў розных дзяржаў.

Трэба адзначыць той факт, што ў апошні час змянілася і тактыка дзейнняў арганізатараў нелегальнай міграцыі. Калі раней, у 90-х гг., колькасны скпад групы нелегальных мігрантаў, якія затрымліваліся органамі ўнутраных спраў, даходзіў да 40 чалавек, то ў цяперашні час групы значна меншай колькасці фарміруюцца непасрэдна перад перасячэннем дзяржаўнай граніцы або на канчатковай стадыі падрыхтоўкі да такога перасячэння. Пранікненне на тэрыторыю рэспублікі ажыццяўляецца групамі па 3—5 чалавек з іх наступнай канцэнтрацыяй у невялікіх населеных пунктах і раёнах, якія прымыкаюць да прыгранічных зон, што істотна абцяжарвае іх выяўленне.

Практычная работа і аналіз дзейнасці міліцыі ў гэтым напрамку паказваюць, што органамі ўнутраных спраў затрымліваецца, як правіла, толькі да 30 % асоб, якія ўехалі ў рэспубліку без прававых на тое падстаў. Сапраўдныя маштабы нелегальнай міграцыі замежных грамадзян праз тэрыторыю Беларусі, на думку МУС, значна большыя. Па прыблізных падліках, на тэрыторыі нашай дзяржавы штогод знаходзіцца больш за 50 тыс. незаконных мігрантаў.

Рэалізуючы заканадаўства рэспублікі, з мэтай прадухілення і спынення незаконнай міграцыі і злачыннасці органамі ўнутраных спраў вядзецца пэўная работа. Рэгулярна праводзяцца комплексныя мерапрыемствы, якія прадугледжваюць узмоцненую апрацоўку жылога сектара, вакзалаў, гасцініц, рынкаў, інтэрнатаў і накіраваны на выяўленне асоб, што знаходзяцца на тэрыторыі рэспублікі без прававых на тое падстаў. Органамі ўнутраных спраў у 2002 г. у адносінах да 2240 іншаземцаў былі вынесены пастановы аб дэпартацыі, у 2003 г. — 1800 (пад канвоем 892 і 683 адпаведна). Найбольш часта выносіліся пастановы аб дэпартацыі грамадзян Індыі, Азербайджана, В'етнама, Грузіі, Малдовы, Узбекістана, Афганістана і інш.

Асноўнымі цяжкасцямі ў дэпартацыі замежных грамадзян і асоб без грамадзянства з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, на думку МУС, з'яўляюцца:

1. *Адсутнасць у органах унутраных спраў грашовых сродкаў для дэпартацыі з тэрыторыі дзяржавы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства.*

У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у выпадку дэпартацыі з тэрыторыі Беларусі дадзеная працэдура ажыццяўляецца за кошт асабістых сродкаў іншаземца, прымаючай арганізацыі або фізічнай асобы, якая хадайнічае аб уездзе іншаземца на тэрыторыю Беларусі, а ў выпадку адсутнасці ў іншаземца такіх сродкаў — за кошт бюджэту нашай дзяржавы. Аднак, як правіла, сродкі для ажыццяўлення працэдуры дэпартацыі ў замежных грамадзян адсутнічаюць або наяўнасць іх яны хаваюць ад органаў унутраных спраў. Пры затрыманні груп нелегальных мігрантаў (ад 5 да 10 чалавек), выяўляецца, што ў іх адсутнічаюць нацыянальныя пашпарты і грашовыя сродкі на праезд назад, што стварае дадатковыя праблемы па ажыццяўленні дэпартацыі.

2. *Адсутнасць у асоб, якія падлягаюць дэпартацыі, дакументаў, што пацвярджаюць іх асобу і неабходны для вяртання ў дзяржаву свайго грамадзянства.*

Практыка работы органаў унутраных спраў паказвае, што ідэнтыфікаваць іншаземца, які не мае дакументаў, што пацвярджаюць яго асобу, вельмі складана, і гэта працэдура нярэдка займае не адзін месяц. Дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы краін-донараў нелегальнай міграцыі на тэрыторыі Беларусі адсутнічаюць або знаходзяцца за межамі рэспублікі, ажыццяўляюць сваю дзейнасць па сумяшчальніцтве і неахвотна аказваюць садзеянне органам унутраных спраў у вырашэнні дадзенага пытання.

3. *Адсутнасць у Рэспубліцы Беларусь цэнтра часовага ўтрымання замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія падлягаюць дэпартацыі.*

Наяўнасць абазначанага цэнтра дазволіла б органам унутраных спраў сістэматызаваць работу з такой катэгорыяй грамадзян, эфектыўна праводзіць працэдуру ідэнтыфікацыі іншаземцаў і вырашаць іншыя практычныя пытанні органаў унутраных спраў для дэпартацыі замежных грамадзян з тэрыторыі Беларусі.

У цяперашні час іншаземцы, якія падлягаюць дэпартацыі пад канвоем, знаходзяцца ў ізалятарах часовага ўтрымання або прыёмніках-размеркавальніках органаў унутраных спраў. Акрамя таго, у 2004 г. у г. Оршы адчынены пункт міграцыйнага кантролю, які павінен дапамагчы работе адпаведных службаў вырашаць пытанні нелегальнай міграцыі на тэрыторыі нашай краіны.

У рамках барацьбы з нелегальнай міграцыяй у Беларусі праведзена шэраг мерапрыемстваў. У маі 2003 г. рэспубліка далучылася да Канвенцыі аб барацьбе з транснацыянальнай злачыннасцю і да двух Пратаколаў аб гандлі людзьмі і незаконнай міграцыі. Гэта дае магчымасць больш эфектыўна супрацоўнічаць у дадзенай сферы з іншымі краінамі. Прынята трэцяя рэдакцыя Закона «Аб бежанцах», завяршаецца падрыхтоўка адпаведных падзаконных актаў. З лютага 2003 г. уступіў у сілу Закон аб крымінальнай адказнасці за арганізацыю незаконнай міграцыі, а таксама за парушэнне правіл праезду і знаходжання замежных грамадзян у Рэспубліцы Беларусь. Пры распрацоўцы заканадаўчых актаў улічваюцца адпаведныя законы Расіі з мэтай іх гарманізацыі. МУС распачаў шэраг мер па ўдасканальванні кіравання міграцыйнымі працэсамі, па супрацьдзеянні незаконнай міграцыі. Створаны Дэпартамент па грамадзянстве і міграцыі МУС РБ, у якім функцыяніруе Упраўленне па знешняй працоўнай міграцыі бежанцаў і прыстанішчы. Распрацаваны і рэалізуецца план мерапрыемстваў па павышэнні эфектыўнасці барацьбы з незаконнай міграцыяй. Праводзяцца перагаворы аб рэадмісіі з Расіяй і Латвіяй, рыхтуюцца пагадненні з іншымі краінамі. Пашыраюцца міжнародныя кантакты МУС з праваахоўнымі органамі іншых дзяржаў, асабліва з Расіяй (пачата выдача міграцыйных карт). Дзейнічае сумесная група высокага ўзроўню Расія—Беларусь па выпрацоўцы ўзгодненых мерапрыемстваў міграцыйнай палітыкі. Праводзіцца пастаянны абмен інфармацыяй аб незаконнай міграцыі і адпаведных асобах, аказваецца ўзаемнае садзеянне ў гэтай сферы.

Разам з тым неабходна ўлічваць і той факт, што сярод мігрантаў ёсць людзі, якія сапраўды маюць патрэбу ў падтрымцы і абароне, што наглядна дэманструе ўсю складанасць праблемы, з якой сутыкаюцца дзяржавы ў дадзенай галіне.

*ЛІТАРАТУРА*


1. Беларусь: Регулирование миграционных процессов и защита беженцев // Система защиты беженцев и предоставления убежища в РБ: Материалы междунар. семинара. 24—26 сент. 2003 г. Мн., 2003.
2. *Загорец И. В.* Миграция населения и миграционная политика. Мн., 2000.
3. Материалы Департамента по гражданству и миграции МВД РБ.
4. *Шаходько Л. П.* Миграционные процессы в Республике Беларусь // Белорусский журнал международного права и международных отношений. 2000. № 5. С. 16—25.

SUMMARY

*Problems of illegal migration on the territory of Belarus during the modern period are examined. The basic problems of deportation of illegal immigrants are analyzed. The estimation of actions on struggle against illegal migration in Belarus is given.*

*УДК 913 (476)*

***М. Г. Ясавееў, В. В. Крылова***

## КУРОРТАЛАГІЧНАЕ РАЯНІРАВАННЕ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Шматфактарнасць асноўных крытэрыяў, пакладзеных у аснову курорталагічнага раяніравання, абумовіла неабходнасць выкарыстання сістэмнага падыходу да дадзенай праблемы. Методыка курорталагічнага раяніравання грунтуецца на комплексным аналізе ландшафтных, медыка-кліматычных і экалагічных характарыстык, пры гэтым улічваюцца наяўныя гідрамінеральныя рэсурсы і аб'екты культурна-гістарычнага набытку краіны [1; 3—4; 6].

Рэспубліка Беларусь валодае разнастайнымі прыроднымі лячэбнымі рэсурсамі: ландшафтнымі, спрыяльным клiматам, мінеральнымі водамі, лячэбнымі гразямі і інш.

Біякліматычныя ўмовы Беларусі характарызуюцца наступнымі медыка-кліматычнымі паказчыкамі: ультрафіялетавым камфортам з умераным дэфіцытам ультрафіялетавай радыяцыі ў халодны перыяд; значнай інтэнсіўнасцю цыкланічнай цыркуляцыі; зменлівым рэжымам надвор'я са слабай зменлівасцю тэмператур і моцна выражанай зменлівасцю атмасфернага ціску; ступенню ветравой нагрузкі ад умеранай да моцнай; павышаным рэжымам вільготнасці. Паводле інтэгральнай ацэнкі ўсіх медыка-кліматычных характарыстык біяпатэнцыялу, Беларусь належыць да тэрыторый з перавагай трэніруючых умоў.

Па ступені адпаведнасці медыка-кліматычных умоў для кліматалячэння тэрыторыя падзяляецца на раёны: з найбольш спрыяльнымі біякліматычнымі ўмовамі (раёны Слуцка і Лепеля); спрыяльнымі біякліматычнымі ўмовамі (паўночна-ўсходнія, паўднёва-ўсходнія і заходняя частка цэнтральных раёнаў); адносна спрыяльнымі біякліматычнымі ўмовамі (большая частка заходніх, паўночных і цэнтральных раёнаў); найменш спрыяльнымі біякліматычнымі ўмовамі (асобныя невялікія ўчасткі крайняга захаду і крайняй поўначы рэспублікі і раён к захаду ад Мінска).

Паводле ландшафтна-эстэтычнай ацэнкі, краіна падзелена на раёны з рознай катэгорыяй маляўнічасці. Найбольш каштоўныя ў эстэтычных адносінах раёны знаходзяцца ў межах узвышшаў поўначы і цэнтра рэспублікі: Браслаўскі, Няшчэрдаўскі, Свянцянскі, Ушацка-Лепельскі, Невельска-Гарадоцкі, Віцебскі, Мінскі, Ашмянскі, Навагрудскі.

Мінеральныя воды і лячэбныя расолы рэспублікі прадстаўлены некалькімі бальнеалагічнымі тыпамі, сярод якіх вылучаны наступныя: без спецыфічных кампанентаў складу і якасцей; бромныя воды і ёда-бромныя расолы; сульфідныя і серавадародныя воды і расолы; жалезістыя, радонавыя воды; фторутрымліваючыя і селенаўтрымліваючыя воды; воды з павышаным утрыманнем арганічнага рэчыва. Асаблівасці прыродных умоў Беларусі вызначылі шырокае развіццё ў яе межах двух асноўных тыпаў лячэбных гразей — тарфяных і сапрапелевых. Агульныя рэсурсы лячэбных гразей значныя.

Сістэма курорталагічнай ацэнкі тэрыторыі складаецца з параўнальнай характарыстыкі як асобных кампанентаў сістэмы (ландшафты. клімат, экалогія), так і іх сумеснага ўздзеяння на прыроднае асяроддзе і арганізм чалавека. Пры курорталагічным раяніраванні тэрыторыі Беларусі выкарыстаны картаграфічны, параўнальны геолага-геаграфічны і геаэкалагічны метады [2; 5; 7]. Ландшафтна-кліматычная схема, на якой заснавана курорталагічнае раяніраванне, была атрымана картаграфічным метадам шляхам накладання і сумеснага аналізу 3-х картасхем: эстэтычных якасцей, біяклімату і экалагічнага стану. У кожнай з гэтых складальных тэрыторыя Беларусі была падзелена на спрыяльныя, адносна і ўмоўна спрыяльныя плошчы. Характарыстыкі тыпаў тэрыторый па ступені адпаведнасці іх для курорталагічнага засваення змешчаны ў табліцы.